# Партыйныя арганізацыі Палесся ў барацьбе за ўздым сельскай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд

**В. Е. ЛАБАНОК**
**Сакратар Палескага абкома КП(б)Б**

Да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі працоўныя Палесся, як і ўвесь беларускі народ, знаходзіліся пад жорсткім палітычным, эканамічным і нацыянальным гнётам царызма. Палессе было самым глухім і адсталым кутком Беларусі і нават назва яго стала сінонімам цемры і адсталасці.

Пазбаўленыя ў большасці сваёй зямлі, сяляне падвяргаліся бязлітаснай эксплаатацыі з боку памешчыкаў і капіталістаў. Па статыстыцы пазямельнай уласнасці 1877 года відаць, што па Мазырскаму павету толькі 18 процантаў зямлі належала сялянам. Астатняя зямля была ўласнасцю дваран. Засілле памешчыкаў тут праяўлялася мацней, чым у іншых месцах Беларусі. Памешчык Кеневіч на тэрыторыі Мазырскага павета меў звыш 35 тысяч дзесяцін зямлі, немец Іоган Ансельм толькі ў Мазырскай воласці ўладаў 10 тысячамі дзесяцін зямлі.

Мізэрныя зямельныя ўчасткі, якія знаходзіліся ў карыстанні сялян, своечасова не апрацоўваліся з-за адсутнасці цягла і інвентара. У 1913 годзе ў Мазырскім павеце 3.513 сялянскіх гаспадарак не мелі рабочай жывёлы, 1.522 сям'і былі бескароўнымі, 951 сям'я зусім не мела ніякай жывёлы. Як правіла, у большасці сялян ніколі нехапала хлеба да новага ўраджаю. У прадуктовым балансе сялянскай сям'і вялікае месца займала лебяда і мякіна, а ў неўраджайныя гады тысячы сямей хранічна недаядалі і часта паміралі ад голаду.

Беззямелле, невыносна вялікія падаткі і высокая арэндная плата канчаткова разаралі сялян, прымушалі іх ісці батракамі да кулакоў і памешчыкаў, шукаць сродку да існавання на старане. Як мінімум, 40 процантаў мужчын Мазырскага павета ва ўзросце ад 16 да 60 год працавалі на адыходных промыслах.

Галоднае, беспрасветнае жыццё накладала свой адбітак на ўсе бакі быту. Захворванні і смяротнасць узрасталі з кожным годам. Па справаздачах Мінскага земства відаць, што Мазырскі павет быў ачагом малярыйных захворванняў. У 1907 годзе малярыяй тут хварэла 6.652 чалавекі. У 1908 годзе агульная колькасць захворванняў павялічылася да 15.000. Гэта, зразумела, далёка няпоўныя даныя, бо большая частка насельніцтва не звярталася ні за якой медыцынскай дапамогай і нікому не заяўляла аб сваіх немачах. Хвароба «калтун» была настолькі распаўсюджанай, што наогул не паддавалася ніякаму ўліку. Аб ахове здароўя працоўных не магло быць і гутаркі. У 1896 годзе на тэрыторыі Мазырскага павета была толькі адна сельская больніца на 10 коек і тры ўрачы, з якіх адзін павятовы і два сельскіх.

88,4 процанта ўсяго насельніцтва Палесся было непісьменным. На тэрыторыі Палесся меліся тры гімназіі і тры гарадскіх вучылішчы, якія былі даступны толькі дзецям багатых. Па ўсёй вобласці было каля 150 пачатковых школ. Аднак, нават дзеці, пражываўшыя ў населеных пунк-

тах, дзе былі гэтыя школы, не мелі магчымасці іх скончыць. Па даных перапісу пачатковых школ 1911 года відаць, што ў Мазырскім павеце на кожных 100 дзяцей, якія навучаліся ў першым класе, на другі клас прыходзілася толькі 41, а на чацверты — толькі 4. Гэта значыць, што з кожных 25 чалавек, паступіўшых у пачатковую школу, канчаў яе толькі адзін.

Народны паэт БССР Янка Купала ў сваёй выдатнай паэме «Над ракой Арэсай» так рысуе жыццё дарэвалюцыйнага Палесся:

Жывуць людзі ў хатах,
Плятуць сабе лапці,
Каб з торбай у латах
Пайсці жабраваці.

Іх розум балота
Трымае палонна, —
Красуе цямнота,
Растуць забабоны.

Пад шум бесканечны
Бярозаў і соснаў,
Сахой недарэчнай
Аруць пясок млосна.

Легенды і казкі
Прыгонных законаў
Паўзуць мохам вязкім,
Багуннем зялёным.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя ліквідавала палітычны, эканамічны і нацыянальны гнёт. З рук вялікіх правадыроў бальшэвіцкай партыі Леніна і Сталіна беларускі народ упершыню за шматвяковую гісторыю атрымаў сваю дзяржаўнасць.

Зямля, аб якой марылі многія пакаленні сялян, перастала належаць памешчыкам і капіталістам і перайшла ва ўласнасць народа. Адмена прыватнай уласнасці на зямлю, перараспрадзяленне зямлі ў інтарэсах сялян — беднякоў і серадня́коў, паскорылі адраджэнне сельскай гаспадаркі і ўздым матэрыяльнага ўзроўню працоўных мас вёскі.

Карэнныя змяненні ў развіцці сельскай гаспадаркі адбыліся ў сувязі з правядзеннем суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класа.

«Гэта быў, — гаворыць таварыш Сталін, — найглыбейшы рэвалюцыйны пераварот, скачок з старога якаснага стану грамадства ў новы якасны стан, роўназначны па сваіх выніках рэвалюцыйнаму перавароту ў кастрычніку 1917 года».

У рукі калгасаў перайшлі не толькі зямельныя надзелы сялян-аднаасобнікаў, уступіўшых у калгас, але і землі кулакоў. Калгасам былі выданы дзяржаўныя акты на вечнае карыстанне зямлёй. На службу сацыялістычнай сельскай гаспадарцы была пастаўлена магутная механізаваная база.

У Палескай вобласці было арганізавана 22 дзяржаўныя машынна-трактарныя станцыі. На калгасных палях працавалі сотні трактараў, 116 камбайнаў, вялікая колькасць складаных малатарань, трактарных плугоў, сеялак, культыватараў, лушчыльнікаў, ільноцерабілак, бульбасаджалак і іншых сельскагаспадарчых машын. У сельскай гаспадарцы вобласці працавалі многія сотні аўтамашын. Пасеўныя плошчы калгасаў былі даведзены да 233.800 гектараў. Шырока прымяняліся агратэхнічныя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне ўраджайнасці.

Легенда аб тым, што палеская зямля з'яўляецца неўрадлівай, што тут нельга дабіцца высокіх ураджаяў, была апракінута гераічнай працай калгаснікаў і калгасніц. На Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў перадваенныя гады былі прадстаўлены дзесяткі палескіх калгасаў, сотні лепшых палąводаў, жывёлаводаў, наватараў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Асабліва шырока былі прадстаўлены Тураўскі і Брагінскі раёны. Перадавікі сельскай гаспадаркі — лепшыя звеннявыя, брыгадзіры, работнікі жывёлагадоўчых ферм, старшыні калгасаў, спецыялісты сель-

скай гаспадаркі — узнагароджваліся ордэнамі і медалямі СССР, залатымі і сярэбранымі медалямі Галоўвыстаўкома.

З кожным годам расла колькасць калгасаў, якія дабіваліся высокай ураджайнасці збожжавых, бульбы, тэхнічных, гароднінных і іншых культур. Калгас імені Тэльмана, Брагінскага раёна, у 1940 годзе сабраў ураджай збожжавых са ўсёй плошчы пасева па 15 цэнтнераў з гектара, бульбы—па 190 цэнтнераў, табаку—па 44 цэнтнеры, гароднінных культур—па 360 цэнтнераў, а з асобных участкаў азімай пшаніцы — па 35 цэнтнераў і ячменю—па 25 цэнтнераў з гектара. Калгас «Савецкая Беларусь», Тураўскага раёна, са ўсёй плошчы пасеву сабіраў па 21,5 цэнтнера пшаніцы і па 19 цэнтнераў жыта з кожнага гектара. Калгас «Чырвоныя Лукі», Васілевіцкага раёна, асушыў 240 гектараў балот і на асушаных землях атрымаў у 1940 годзе ўраджай збожжавых культур 21 цэнтнер з гектара, бульбы — 230 цэнтнераў.

У перадваенныя гады ў вобласці шырока культывіраваліся пасевы такіх тэхнічных культур, як паўднёвая каноплі, махорка, кок-сагыз. У Хойніцкім, Брагінскім і іншых раёнах усё больш знаходзілі распаўсюджанне бахчавыя культуры, паўднёвыя гатункі пладавых культур, а таксама вінаград, які многія калгасы пачалі разводзіць як таварную культуру.

Няўхільна расла грамадская жывёлагадоўля. У калгасах вобласці было створана звыш 3000 таварных жывёлагадоўчых ферм, у якіх налічвалася сотні тысяч коней, буйнай рагатай жывёлы, авечак, свіней. На 100 чалавек насельніцтва ў вобласці прыпадала буйнай рагатай жывёлы 44,9 галоў, свіней 26,6 галоў, авечак і коз 28,5 галоў.

Штогод раслі даходы калгасаў, матэрыяльны і культурны дабрабыт калгаснікаў. У вобласці мелася каля тысячы школ, у якіх працавала да 5000 настаўнікаў і навучалася звыш 130 тысяч школьнікаў, 17 школ рабочай і сельскай моладзі, 87 дзіцячых садоў, вялікая сетка лячэбных устаноў, у якіх працавала 175 урачоў, не лічачы медыцынскіх работнікаў сярэдняй кваліфікацыі, 503 клубы, 488 масавых бібліятэк, драматычны тэатр, шырокая сетка кіноўстановак і т. д.

Пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б), Саюзнага ўрада і асабіста таварыша Сталіна, пры дапамозе брацкіх народаў Савецкага Саюза і ў першую чаргу вялікага рускага народа, наша рэспубліка, а разам з ёю і Палеская вобласць, стала адной з перадавых рэспублік у Саюзе.

Калгаснікі вобласці пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый прыступілі да выканання прынятай па ініцыятыве таварыша Сталіна пастановы Савета Народных Камісараў СССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) ад 6 сакавіка 1941 года «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і выкарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенакосаў». Ажыццяўленне гэтай грандыёзнай сталінскай праграмы павінна было ператварыць беларускія балоты, якія з'яўляліся раней крыніцай галечы, хвароб і бездарожжа, у высокаўраджайныя калгасныя палі — крыніцу багацця калгасаў і калгаснікаў.

Але мірная творчая праца нашага народа была перарвана вераломным нападам нямецка-фашысцкіх захопнікаў на нашу сацыялістычную Радзіму. За перыяд свайго гаспадарання гітлераўскія акупанты нанеслі сельскай гаспадарцы вобласці велізарныя страты. Яны поўнасцю разрабілі калгасы, машынна-трактарныя станцыі, сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы. Пасеўная плошча збожжавых культур рэзка скарацілася. Зусім былі разбураны севазвароты, знішчаны пасевы кок-сагыза, махоркі і шматгадовых траў. Поўнасцю было ліквідавана калгаснае гародніцтва. Нямецка-фашысцкія захопнікі разрабілі грамадскую жывёлу калгасаў і жывёлу калгаснікаў. Амаль поўнасцю знішчана было

пагалоўе свіней, птушкі, а таксама пчолы ў абсалютнай большасці калгасаў і ў калгаснікаў. У радзе раёнаў (Капаткевіцкім, Петрыкаўскім і іншых) амаль не засталося коней, буйнай рагатай жывёлы, свіней, авечак і коз. У Даманавіцкім раёне пасля выгнання немцаў засталося ўсяго 15 авечак, не было ні адной свінні. Вытворчыя і гаспадарчыя будынкі калгасаў, пабудаваныя на працягу раду год намаганнямі калгаснікаў пры дапамозе Совецкай дзяржавы, а таксама палавіна жылых дамоў былі спалены і разбураны фашысцкімі бандытамі.

Гітлераўскім прыгнятальнікам не ўдалося аднак зламаць патрыятычны дух і свабодалюбівую волю совецкіх людзей. Палеская зямля гарэла пад нагамі нямецкіх акупантаў. На тэрыторыі вобласці дзейнічалі шматлікія партызанскія атрады, якія аб'ядноўвалі дзесяткі тысяч чалавек. Без малага 75 процантаў тэрыторыі вобласці кантралявалі партызаны Палесся аж да прыходу часцей Совецкай Арміі. Пад абаронай партызан знаходзілася больш 200 тысяч чалавек мірнага насельніцтва.

Пасля вызвалення тэрыторыі вобласці ад нямецкіх захопнікаў калгаснае сялянства з вялікім энтузіязмам узялося за аднаўленне соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. За кароткі тэрмін былі адноўлены ўсе 872 калгасы, 7 соўгасаў, створаны 24 машынна-трактарныя станцыі. Аднаўленне калгасаў адбывалася пры вялікім палітычным уздыме працаўнікоў сельскай гаспадаркі, якія занудзіліся па калектыўнай працы.

Вялікая работа пачалася па адбудове дамоў для сельскага насельніцтва, пражываўшага ў зямлянках. Ужо ў 1944 годзе было адбудавана 18.057 дамоў, а ўсяго за пяць год пасля вызвалення вобласці—48.744 дамы.

Нашы поспехі ў аднаўленні сельскай гаспадаркі сталі магчымы толькі дзякуючы самаадданай працы калгаснага сялянства і велізарнай дапамозе, аказанай вобласці, як і ўсёй нашай Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, Саюзным урадам, ЦК ВКП(б) і асабіста таварышам Сталіным.

Толькі ў 1945 годзе калгасы вобласці атрымалі насенную ссуду збожжавых 1.616 тон, бульбы—2.100 тон, ільнонасення—172 тоны. У вобласць была завезена вялікая колькасць сельскагаспадарчых машын, трактараў, камбайнаў, малатарань, аўтамашын і іншага сельскагаспадарчага інвентара. Для аднаўлення жывёлагадоўчых ферм калгаснікі Палесся атрымалі з усходніх абласцей РСФСР вялікую колькасць коней, буйнай рагатай жывёлы, авечак, свіней і птушкі.

Найшырэйшыя перспектывы творчай працы адкрыў перад совецкім народам прыняты Вярхоўным Советам СССР Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі на 1946 — 1950 гады. Калгаснікі і калгасніцы, работнікі МТС і соўгасаў Палесся, як і ўвесь совецкі народ, з велізарным натхненнем успрынялі задачы пасляваеннай сталінскай пяцігодкі і пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый з энтузіязмам узяліся за ажыццяўленне вялікага сталінскага плана.

1947 і 1948 гады былі гадамі далейшай барацьбы калгаснікаў і калгасніц, работнікаў МТС і соўгасаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі і ўсяго совецкага народа за хутчэйшае аднаўленне сельскай гаспадаркі, за атрыманне высокіх і ўстойлівых ураджаяў.

Пачатак гэтай гераічнай і самаадданай барацьбы быў пакладзен лютаўскім Пленумам ЦК ВКП(б), прыняўшым гістарычную пастанову «Аб мерах уздыму сельскай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд». «Цяпер, пасля пераходу да мірнага будаўніцтва, — гаворыцца ў пастанове, — перад нашай партыяй і дзяржавай зноў ва ўвесь рост устала, як самая неадкладная задача, — забяспечыць такі ўздым сельскай гаспадаркі, які

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

дазволіў-бы ў найкарацейшы тэрмін стварыць багацце прадуктаў для нашага насельніцтва, сыравіны для лёгкай прамысловасці і накапленне неабходных дзяржаўных прадуктовых і сыравінных рэзерваў».

Пастанова лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) была сустрэчана працаўнікамі сельскай гаспадаркі Палескай вобласці, як і ўсім совецкім народам, з велізарным энтузіязмам і выклікала небывалы палітычны і вытворчы ўздым. У барацьбе за ажыццяўленне пастановы лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) калгаснікі, работнікі МТС і соўгасаў Палесся пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый дабіліся сур'ёзных поспехаў у аднаўленні і развіцці сельскай гаспадаркі вобласці.

Адным з важнейшых паказчыкаў аднаўлення і развіцця сельскай гаспадаркі з'яўляецца расшырэнне пасеўных плошчаў. Агульная пасеўная плошча па вобласці ў 1948 годзе склала 94,1% к даваеннаму ўзроўню, прычым прырост за апошнія два гады складае 31,2 процанта. Значна павялічыліся пасеўныя плошчы найбольш важных сельскагаспадарчых культур. Пасевы яравой пшаніцы склалі ў 1948 годзе 125,6% к даваеннаму ўзроўню, азімага жыта — 105%, ячменю — 103%, грэчкі — 117,5%, бульбы — 100,5%. Пасевы яравога жыта выраслі ў адносінах да 1940 года амаль у два з палавінай раза, лубіну на ўгнаенне — у два з палавінай раза і на насенне — у паўтара раза, кок-сагыза — больш чым у чатыры разы, шматгадовых і бесцакроўных траў — у шаснаццаць разоў.

Першых поспехаў дасягнулі мы таксама ў росце культуры земляробства. У 1948 годзе 73% азімых пасеяна па чыстых і лубінавых папарах. Радавая сяўба праведзена на плошчы ў 4 разы большай, чым у 1947 годзе. Зябліва паднята ў 3,5 раза больш, чым у 1947 годзе. Веснавое баранаванне азімых праведзена на плошчы ў два разы большай, а падкормка азімых — у два з палавінай раза большай, чым у 1947 годзе. Павялічылася выкарыстанне ўгнаенняў. У 1948 годзе ўнесена ў глебу гною ў два разы, торфу — у чатыры разы і мінеральных угнаенняў — у пяць разоў больш, чым у 1946 годзе.

У барацьбе за павышэнне культуры земляробства выраслі перадавікі сельскай гаспадаркі, калгаснікі і калгасніцы, работнікі МТС і соўгасаў, якія самаахвярна змагаюцца за атрыманне высокага ўраджаю. Лепшыя з іх—звеннявая калгаса імя Сталіна, Васілевіцкага раёна, Еўдакія Арцёмаўна Кухарава, якая дабілася ў 1947 годзе ўраджаю азімага жыта на плошчы 8,5 гектара па 31,9 центнера з гектара, і звеннявая калгаса «Чырвоная Ніва», Брагінскага раёна, Тамара Іванаўна Шкурко, якая дабілася ўраджаю азімага жыта на плошчы 8 гектараў па 30,3 центнера з гектара — удастоены звання Героя Социялістычнай Працы.

У цэлым па вобласці ўраджай збожжавых культур у 1947 годзе быў павялічан на 50 процантаў у параўнанні з папярэднім годам, па бульбе — на 57 процантаў.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы